УДК 947.6

П. С. Кручак, дацэнт

# АФАРМЛЕННЕ АФІЦЫЙНА-КЛЕРЫКАЛЬНАГА НАКІРУНКУ У БЕЛАРУСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX СТ.

The article dwells upon the complex process of historical science development in the second half of the XIXth century. After the uprising suppressing in 1864 representatives of official clerical group were the first to study Belarusian history. In their works Belarus was considered to be an integral part of the Russian Empire; the history of Belarus from the very beginning to the times of incorporating its territory by the Russian Empire was believed to be the collapse period being characterized by tough Polish opression. At dawn of the XXth century these ideas were argumentally disproved by representatives of liberal and democratic group in Belarusian historiography.

**Уводзіны**. У сярэдзіне XIX ст. у выніку развіцця капіталістычных адносін пачаўся працэс фарміравання беларускай нацыі. Гэты працэс праходзіў у даволі складаных умовах. Беларускае грамадства было расколата па канфесійным прызнаку. Сацыяльныя вярхі грамадства з'уляліся ў асноўным каталікамі і адносілі сябе да палякаў. У той жа час праваслаўе большасцю насельніцтва ўспрымалася як «руская вера» і таму праваслаўнае насельніцтва Беларусі аўтаматычна лічылася рускім. Такая сітуацыя, якую актыўна падтрымлівалі і каталіцкае, і праваслаўнае духавенства, не садзейнічала кансалідацыі беларускага этнасу і адмоўна адбівалася на развіцці этнічнай самасвядомасці беларускага народа. У такіх складаных умовах і адбываўся працэс фарміравання беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі. У сярэдзіне XIX ст. гісторыя Беларусі па-ранейшаму заставалася слаба вывучанай. У беларускім і ва ўсім расійскім грамадстве існавалі самыя розныя погляды на мінулае края. У першай палове XIX ст. вывучэннем Беларусі займаліся ў асноўным польскія гісторыкі, якія разглядалі беларускія землі як усходнепольскія з адпаведнымі гэтаму погляду вынікамі. У гэты час з'яўляюцца працы Т. Нарбута, І. Лукашэвіча, А. Рыпіньскага, у якіх гісторыя Беларусі паказваецца ў цеснай сувязі з гісторыяй Польшчы, як яе састаўная частка. Сітуацыя пачала змяняцца пасля падаўлення паўстання 1830–1831 гг., калі царскі ўрад павёў актыўнае наступленне на польскі ўплыў на Беларусі. У гэты час і пачаў фарміравацца афіцыйна-клерыкальны накірунак у беларускай гістарыяграфіі. Яго галоўнай задачай з'ўлялася абгрунтаваць і апраўдаць законнасць далучэння беларускіх зямель да расійскай імперыі і паказаць гістарычнае адзінства рускага, беларускага і ўкраінскага народаў. Канчаткова гэты накірунак сфарміраваўся ў другой палове XIX ст. пасля падаўлення паўстання 1863–1864 гг.

**Асноўная частка**. Паўстанне пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага прымусіла расійскіх дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў і расійскіх вучоных адкрыць для сябе Беларусь і «беларускае пытанне». Палітыка ўрада была накіравана на пераадольванне наступстваў польскага ўплыву на беларускіх землях. Пры гэтым любыя праявы беларускасці разглядаліся як вынік «польскай інтрыгі». У працах расійскіх гісторыкаў і ў афіцыйных матэрыялах амаль знікае назва Беларусь. Яна замяняецца назвай заходне-рускія губерні або Заходні край. Перад грамадскасцю вострa паўсталі пытанні – што гэта за край і які народ яго насяляе. І адказаць на гэтыя пытанні было магчыма толькі звярнуўшыся да вывучэння беларускай гісторыі.

Першымі гэта зрабілі прадстаўнікі ўрадавага лагера. Іх уплыў на беларускую гістарыяграфію у 60–70-я гг. XIX ст. быў рашаючым. Значны ўплыў гэты накірунак аказваў і ў далейшым. Як вядома, галоўнай мэтай паўстання 1863–1864 гг. з'ўлялася адраджэння Рэчы Паспалітай у межах 1772 года. Гэты лозунг знайшоў шырокі водгук у еўрапейскіх краінах. У такіх умовах перад царскім урадам паўстала задача даказаць, што «заходні край» спрадвечна з'ўляецца краем рускім, у свой час сілай захопленым палякамі. Таму на абарону «рускай народнасці і ісконнай праваслаўнай веры» былі мабілізаваны ўсе адміністрацыйна-паліцэйскія, ідэалагічныя і навуковыя рэсурсы. Першай мерай царскага ўрада стала выданне ў 1863 і 1864 гг. пад эгідай міністэрства ўнутраных спраў і ваеннага ведамства двух гістарычных атласаў «Западного края». Гэтыя выданні выконвалі перш за ўсё палітычныя і прапагандысцкія задачы, а ўся гісторыя Беларусі да канца XVIII ст. разглядалася як перыяд «иноверного владычества». Аднак царскі ўрад у Пецярбургу і Віленскі генерал-губернатар М. Мураўёў разумелі, што толькі адміністрацыйнымі і прапагандысцкімі метадамі вырашыць пастаўленныя задачы немагчыма. Таму гісторыкам была дадзена мэта навукова даказаць, што Беларусь – гэта спрадвечна рускі край, насельніцтва якога падверглася паланізацыі ў часы Рэчы Паспалітай. Выкананне гэтай задачы ўсклалі на прадстаўнікоў афіцыйна-клерыкальнага накірунку гістарыяграфіі Беларусі, якія ў сваіх працах развівалі тэзісы аб натуральнасці і законнасці дзяржаўнага «уз'яднання» беларускіх і літоўскіх зямель з расійскай імперыяй, аб непрымусовым «уз'яднанні» уніятаў з праваслаўнай царквой на сaборы

1839 г. у Полацку, аб паўстанні 1863–1864 гг. як бунце польскіх памешчыкаў, якія спужаліся, што пасля адмены прыгоннага права беларускія сяляне схіляцца ў бок падтрымкі расійскіх улад. Гэтыя гістарычныя погляды прапагандаваліся пад дэвізам «За умацаванне ў заходном краі рускіх гістарычных начал» [1, с. 175].

Актыўнымі праваднікамі гэтай палітыкі ў Беларусі стала Віленская навучальная акруга і падначаленая ёй Віленская археаграфічная камісія, якая разгарнула актыўную дзейнасць па выданні дакументаў, што тычаліся гісторыі Беларусі, Літвы і Украіны. Пры падборы матэрыялаў для публікацый члены камісіі кіраваліся наступнымі думкамі: а) паказаць неабгрунтаванасць польскіх прэтэнзій на гэтыя тэрыторыі; б) паказаць праваслаўнае паходжанне шматлікіх дваранскіх радоў Паўднёва-Заходняга краю, якія толькі пазней сталі каталіцкімі, а значыць і польскімі, і тым самым паказаць рускую аснову Правабярэжнай Украіны і Беларусі; в) даказаць, што Заходні край ніколі не быў шчаслівым пад польскай уладай і толькі дзякуючы ўз'яднанню з Расіяй ён вылечыў усе свае раны і атрымаў магчымасць для далейшага гістарычна-палітычнага існавання. Гэтыя задачы Віленская археаграфічная камісія паслядоўна выконвала на працягу ўсіх гадоў сваёй дзейнасці. Усяго было выдадзена 49 тамоў гістарычных крыніц. Аднак яўная тэндэнцыйнасць пры падборы матэрыялаў і даволі нізкі археаграфічны ўзровень выданняў прывялі да таго, што яны не знайшлі прызнання сярод сур'ёзных гісторыкаў і не аказалі эфектыўнага ўздзеяння на грамадкасць.

Другім важным цэнтрам выдавецкай дзейнасці на тэрыторыі Беларусі ў гэты перыяд з'яўляўся Віцебскі цэнтральны архіў старажытных актаў, супрацоўнікі якога апрацавалі і выдалі цэлы шэраг матэрыялаў па гісторыі Віцебшчыны і Магілеўшчыны часоў Вялікага княства Літоўскага.

Вялікую гісторыка-краязнаўчую працу ў Беларусі ў другой палове XIX ст. вялі губернскія статычныя камітэты. У цеснай сувязі з навуковымі цэнтрамі імперыі камітэты праводзілі актыўную працу па зборы і захаванні архіўных матэрыялаў, помнікаў пісьменства і іншых гістарычных крыніц, складалі археалагічныя карты губерняў, стваралі мясцовыя музеі. Вынікам такой працы стала, напрыклад, выданне комплекснага апісання Магілеўскай губерні, а таксама гісторыка-геаграфічныя і гісторыка-статыстычныя апісанні шматлікіх беларускіх гарадоў. Аднак нягледзячы на грунтоўнасць і гістарычную каштоўнасць яны выконвалі акрамя іншага і палітычную задачу – паказаць прыніжаны стан гэтых тэрыторый пад польскай уладай і іх росквіт пасля далучэння да Расіі. У выніку дзейнасць Віленскай археаграфічнай камісіі, Віленскага цэнтральнага архіва старажытных актаў і іншых гісторыка-краязнаўчых цэнтраў Беларусі таго перыяда, якія адстойвалі кансерватыўныя і клерыкальныя погляды на мінулае і сучаснае края, садзейнічала фарміраванню і развіццю ў беларускай гістарыяграфіі ідэалогіі «заходнерусізму».

Прадстаўнікі кансерватыўнага накірунку ў «заходнерусізме» згуртаваліся вакол часопіса «Вестник Западной России», які выдаваўся у 60–70-х гг. XIX ст. у Вільні пад рэдакцыяй К. Гаворскага. Кожны нумар «Вестника» складаўся з чатырох раздзелаў. Першы раздзел прысвячаўся старажытнай гісторыі Беларусі і Украіны. Тут друкаваліся ў асноўным дакументы па гісторыі праваслаўнай царквы, па барацьбе праваслаўя з каталіцізмам і іншыя архіўныя матэрыялы, якія сталі даступнымі дзякуючы дзейнасці Віленскай і Кіеўскай археаграфічных камісій. Другі раздзел складалі непасрэдна артыкулы супрацоўнікаў «Вестника» на гістарычныя тэмы. У трэцім раздзеле змяшчаліся матэрыялы, якія тычыліся актуальных пытанняў грамадскага і палітычнага жыцця краю. У асноўным публікацыі былі прысвечаны барацьбе з польскім і каталіцкім уплывам на беларускіх землях і палеміцы з тагачаснай прагрэсіўнай прэсай. І, нарэшце, у чацвёртым раздзеле змяшчаліся літаратурныя творы той жа самай тэматыкі. Ужо ў першым нумары рэдакцыя заявіла, што ставіць сваёй галоўнай мэтай барацьбу з «сепаратызмам, які імкнецца парушыць непадзельнасць Расіі, змаганне за адзіную рускую народнасць» [2, с. 23]. У адпаведнасці з гэтымі мэтамі «Вестник» на сваіх старонках усхваляў усё, што служыла справе русіфікацыі краю. Усе публікацыі мелі ярка выражаны тэндэнцыйны характар. К. Гаворскі і яго прыхільнікі даказвалі, што існуе адзіны рускі народ, а ўсе этнічныя асаблівасці беларусаў тлумачылі вынікам польска-каталіцкай экспансіі. Таму гэтыя асаблівасці неабходна як мага хутчэй знішчыць для аднаўлення «спрадвечна рускага характару краю». Аднак крайне рэакцыйны характар выдання і асабістыя якасці яго рэдактара выклікалі незадавальненне нават часткі расійскіх чыноўнікаў і рабілі яго непапулярным сярод насельніцтва краю. Да таго ж у канцы 60-х – пачатку 70-х гг. пазіцыя «Вестника» стала разыходзіцца з пазіцыяй паслямураўёўскай адміністрацыі Заходняга края. У выніку часопіс перастаў атрымоўваць фінансавую дапамогу і ў хуткім часе спыніў сваю дзейнасць.

Найбольш паслядоўным прадстаўніком ліберальнага накірунку ў «заходнярусізме» стаў прафесар Пецярбургскай духоўнай акадэміі, ураджэнец Гродзеншчыны М. Каяловіч.

У аснове канцэпцыі гісторыі Беларусі М. Каяловіча знаходзілася ідэя аб вяршэнстве праваслаўя над усімі іншымі рэлігіямі. У сваіх

працах вучоны развіваў тэзіс аб адзінстве інтарэсаў рускага народа, да якога ён адносіў беларусаў і украінцаў. Усю гісторыю Беларусі М. Каяловіч па сутнасці зводзіў да нацыянальна-кафэнсійнага пытання, якуе ён вырашаў з пазіцыі славянафільства. Найбольш паслядоўна канцэпцыя Каяловіча выкладзена у яго працы «Лекции по истории Западной России», якая была выдадзена ў 1864 г., а таксама «Чтениях по истории Западной России», якія выйшлі ў 1884 г. Да Заходняй Расіі М. Каяловіч адносіў Украіну, Беларусь і Літву, якія раней уваходзілі ў склад Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. У якасці галоўнага фактара, які вызначаўся ў гісторыі Заходняй Расіі, гісторык назваў барацьбу паміж Расіяй і Польшчай за ўплыў ў краі. Вучоны падкрэсліваў, што Польскі ўплыў у эпоху феадалізму меў вельмі цяжкія наступствы. Ён садзейнічаў знішчэнню старажытнарускіх дэмакратычных традыцый у грамадскім жыцці, прывёў да нацыянальнай і рэлігійнай дыскрымінацыі мясцовага насельніцтва. Таму падзеі, звязаныя з падзеламі Рэчы Паспалітай, М. Каяловіч ацэньваў як акт гістарычнай справядлівасці, як уз’яднанне спрадвечных пачаткаў Заходняй і Усходняй Русі [3, с. 196]. Праваслаўная рэлігія і царква аб’яўшчаюцца ў гісторыі Заходняй Русі галоўнымі цывілізацыйнымі сіламі. Згодна з гэтай пазіцыяй антыфеадальныя выступленні ў XVII–XVIII стст. гісторык разглядае як выступленні заходнярускага народа ў абарону праваслаўнай веры. Пры гэтым поўнасцю ігнараваліся сацыяльна-эканамічныя прычыны гэтых выступленняў.

Канцэпцыя М. Каяловіча ў сувязі з яе яўнай тэндэнцыйнасцю выклікала адмоўную ацэнку з боку расійскай ліберальнай і дэмакратычнай гістарыяграфіі. Так, У. І. Пячэта назваў «Чтения по истории Западной России» цудоўным прыкладам таго, як нятрэба вывучаць гістарычныя з’явы [4, с. 201]. Асноўныя палажэнні М. Каяловіча былі абгрунтавана абвергнуты ўжо ў 80–90-х гг. XX ст. прадстаўнікамі ліберальнага накірунку ў айчыннай гістарыяграфіі – У. Антановічам і яго вучнямі ў Кіеўскім універсітэте, М. Любаўскім і яго вучнямі ў Маскоўскім універсітэце і інш.

Канцэпцыя М. Каяловіча працягвала існаваць і развівацца ў працах яго вучняў і аднадумцаў. Засвоіўшы ад свайго настаўніка ідэі вялікадзяржаўя і манархізму, яны развівалі асноўныя тэзісы М. Каяловіча ў канцы XIX – пачатку XX ст. Аднак, нягледзячы на падтрымку з боку кіруючых колаў, якія разглядалі канцэпцыю М. Каяловіча і яго паслядоўнікаў як навуковую аргументацыю і абгрунтаванне русіфікатарскай палітыкі ў Беларусі, накірунак ужо не мог занімаць вядучыя пазіцыі ў гістарычнай навуцы. У канцы XIX – пачатку XX ст. вывучэннем Беларусі актыўна заняліся прадстаўнікі беларускай дэмакратычнай інтэлігенцыі, якія павялі барацьбу супраць афіцыйна-манархічнай вялікадзяржаўнай трактоўкі гісторыі Беларусі.

**Заключэнне**. Такім чынам, у другой палове XIX ст. пачынаецца працэс фарміравання беларускай гістарыяграфіі. Ён праходзіў у даволі складаных умовах. Фарміраванне беларускай нацыі замаруджвалася сацыяльным і нацыянальным гнётам з боку расійскіх улад, якія нагул адмаўлялі беларусам у праве на самастойнае існаванне. У выніку першымі да вывучэння гісторыі Беларусі звярнуліся прадстаўнікі афіцыйна-клерыкальнага лагера. У сваіх працах яны абгрунтоўвалі ідэі аб існаванні адзінага «рускага» народа і ўсе асаблівасці беларусаў тлумачылі польскім уплывам. Уся гісторыя Беларусі да ўключэння яе ў склад Расійскай імперыі разглядалася як перыяд цемры і жабрацтва. І толькі ў складзе Расіі беларусы і ўкраінцы атрымалі магчымасць пераадоліць усе цяжкасці і зноў аб’яднацца з брацкім рускім народам. Тым самым беларусам па сутнасці адмаўлялася ў праве на самастойнае палітычнае існаванне. Аднак у канцы XIX – пачатку XX ст. гэтыя погляды былі навукова абвергнуты ў працах прадстаўнікоў беларускай ліберальнай і нацыянальнай гістарыяграфіі.

## Літаратура

1. Доўнар-Запольскі, М. В. Гісторыя Беларусі / М. В. Доўнар-Запольскі. – Мінск, 1994.
2. Цвікевіч, А. «Западно-руссизм». Нарысы з гісторыі грамадзянскай мыслі на Беларусі ў XIX – п. XX в. / А. Цвікевіч.– Мінск, 1993.
3. Каялович, М. О. Лекции по истории Западной России / М. О. Каялович. – СПб., 1864.
4. Карев, Д. В. Белорусская и украинская историография к. XVIII – н. XX стст. / Д. В. Карев. – Вильнюс, 2007.